«Літаратурная гасцёўня – цікава і пазнавальна»

(25.04.2024)

З мэтай далучэння дзяцей да беларускай мовы і культуры ва ўмовах сямейнага выхавання ў сярэдняй групе «Дзьмухаўцы» адбыўся бацькоўскі сход у форме літаратурнай гасцёўні.





Пачаўся сход з вечара паэзіі «Гучы беларуская мова». Бацькам былі прапанаваны: віктарына «Беларускія народныя казкі», гульні «Пазнайце радкі з вершаў беларускіх пісьменнікаў», «Раскладзіце малюнкі да казак у правільнай паслядоўнасці».



Таксама бацькі з задавальненнем паказвалі свае  веды пра родную мову і свой край у такіх гульнях, як «Чароўны куфэрак», «Перакладчыкі», «Прыказкі і прымаўкі роднага краю».





Педагогі  пазнаёмілі бацькоў з  работай, якая праводзіцца ў групе  на занятках па адукацыйнай вобласці “Развіццё беларускага маўлення і культуры маўленчых зносін”, а таксама ў нерагламентаванай дзейнасці выхаванцаў. Гэта падштурхнула бацькоў  любіць і паважаць родную мову,

краіну, традыцыі, народную спадчыну і жаданне фарміраваць усё гэта ў сваіх дзяцей.